PolotskSU



УДК [94(438)+[323.311+342.5](476)(091)]„1735/1763”

# МІХАЛ СЯЛІЦКІ Ў ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫМ ЖЫЦЦІ ПОЛАЦКАГА ВАЯВОДСТВА Ў ПАНАВАННЕ АЎГУСТА III (1735 – 1763 ГГ.)

*канд. гіст. навук, дац. А.У. МАЦУК*
Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск

*Міхал Сяліцкі паходзіў з вядомага ў Полацкім і Віцебскім ваяводствах роду. Сяліцкі не займаў ніводнага урада ў Полацкім ваяводстве, але меў значны ўплыў сярод мясцовай шляхты. Гэта адбылося, дзякуючы ўдаламу выбару ім палітычных саюзнікаў: чашнік ВКЛ Юзаф Шчыт, Корсакі Бабыніцкія, Корсакі, Удзельскія і Буйніцкія. Апошнія супрацоўнічалі ў Полацкім ваяводстве з Сяліцкім ўсё праўленне Аўгуста III, што было ўмацавана роднаснымі сувязямі. Больш за тое, Ян Буйніцкі становіцца самым блізкім саюзнікам і прыяцелем Міхала Сяліцкага. Разам яны найбольш зацята змагаюцца ў Полацкім ваяводстве з магутнай шляхецкай групоўкай Корсакаў Бабыніцкіх. Міхал Сяліцкі да канца 1752 - пачатку 1753 гг. быў прыхільнікам Радзівілаў, але потым, незадаволены іх дапамогай у атрыманні новых урадаў, становіцца прыхільнікам Фаміліі. Ён быў прыязна прыняты лідарам Фаміліі канцлерам ВКЛ Міхалам Чартарыйскім і становіцца яго рэгентам канцылярыі. Падтрымка Чартарыйскага дапамагае Сяліцкаму ў канфлікце з іншымі прыхільнікамі Фаміліі Грабніцкімі. У выніку Міхал Сяліцкі становіцца лідарам Фаміліі ў Полацкім ваяводстве.*

*Ключавыя словы:* *Полацкае ваяводства, соймік, сойм, шляхта, магнаты, магнацкая групоўка, Радзівілы, Чартарыйскія.*

Уводзіны. Міхал Сяліцкі быў сынам віцебскага падваяводы Рэмігіяна Сяліцкага і Алены з Гуркаў. Яго бацька зрабіў выдатную кар’еру будучы па чарзе полацкім стражнікам, полацкім гродскім суддзёй і віцебскім падваяводай. Яшчэ да смерці бацька пастараўся аб перадачы Міхалу Сяліцкаму вайпунскага староства. Міхал Сяліцкі атрымаў у спадчыну значныя ўладанні: Чарневічы, Селішча, Саланевічы, Янаў, Забелле, Бабынічы, Завозер’е, Антавіль і іншыя [1, л. 69об]. Такі вялікі маёнтак і ўплывы бацькі ў Полацкім і Віцебскім ваяводствах адкрывалі вялікія перспектывы для карьеры Міхала Сяліцкага ў гэтым рэгіёне ВКЛ.

У канцы панавання Аўгуста II у грамадска-палітычным жыцці Полацкага ваяводства Сяліцкія супрацоўнічалі з брэсцкім кашталянам Валяр’янам Жабай. Разам з вышэйзгаданым Жабай яны былі прыхільнікамі Радзівілаў. У гэты час Сяліцкія параднілiся нават з радзівілаўскім губернатарам Феліцыянам Юнашай Пяскоўскім, які ажаніўся на сястры вайпунскага старосты – Розе. Іншая сястра Міхала Іяана была замужам за полацкім земскім судзічам Бернардам Пжысецкім. Гэта садзейнічала ўсталяванню супрацоўніцтва Сяліцкіх з гэтым уплывовым родам у Полацкім ваяводстве [2, s. 127].

PolotskSU



Асноўная частка. Вайпунскі староста Міхал Сяліцкі ў пачатку верасня 1732 г. ажаніўся на Элеаноры з Буйніцкіх, сястры ўплывовых полацкага гродскага сурагатара і полацкага падчашага Антонія і полацкага скарбніка Казіміра. Буйніцкія пайшлі на выплату значнага пасагу ў 5000 талераў бітых (адзін талер біты лічылі па 8 злотых). У адказ Міхал Сяліцкі 23 красавіка 1736 г. запісаў гэтую сумму ў 5000 талераў бітых жонцы на сваім уладанні Чарневічы [3, p. 503-504v; 4, с. 109]. З гэтага часу Міхал Сяліцкі пачынае супрацоўнічаць з Буйніцкімі і ў грамадска-палітычным жыцці Полацкага ваяводства. Асабліва з пляменікам Элеаноры Янам Буйніцкім (сын полацкага падчашага Антонія). Менавіта родзічы Буйніцкія і Пжысецкія становяцца саюзнікамі Міхала Сяліцкага і ў грамадска-палітычным жыцці Полацкага ваяводства.

Сваю грамадска-палітычную дзейнасць Міхал Сяліцкі пачаў яшчэ пад час бескаралеўя 1733 – 1735 гг. На элекцыйны сойм 1733 г. Міхал Сяліцкі быў абраны паслом з Віцебскага ваяводства [5, арк. 6]. На гэтым сойме Міхал Сяліцкі фігураваў адразу ў спісе выбаршчыкаў Станіслава Ляшчынскага (гэта значыць яго прыхільнікаў), так і сярод падпісаўшых маніфест на Празе (гэта значыць праціўнікаў Ляшчынскага). Прычым у абодвух выпадках Міхал Сяліцкі быў упісаны ў спіс не віцебскай, а полацкай шляхты [6, k. 268, 345-346]. Нажаль невядома бок якога з канкурэнтаў Аўгуста ІІІ ці Станіслава Ляшчынскага трымаў Міхал Сяліцкі пад час бескаралеўя. Яго магнацкія пратэктары Радзівілы былі праціўнікамі Станіслава Ляшчынскага, а саюзнікі ў Полацкім ваяводстве Буйніцкія наадварот падтрымалі выбар каралём Ляшчынскага. Нажаль нам не ўдалося выявіць больш інфармацыі пра дзейнасць Міхала Сяліцкага пад час бескаралеўя 1733 – 1735 гг.

У 1736 г. Міхал Сяліцкі разам з полацкім гродскім суддзёй Юзафам Падбіпентай быў абраны дэпутатам на Трыбунал ВКЛ на полацкім грамнічным сойміку [7, s. 170]. Праўдападобна, што ў гэты час Сяліцкі ў Полацкім ваяводстве дзейнічаў разам са сваімі родзічамі Буйніцкімі.

Разам з Буйніцкімі і іх саюзнікам чашнікам ВКЛ Юзафам Шчытом Міхал Сяліцкі ужо дакладна дзейнічаў на полацкім грамнічным сойміку 1737 г. Іх праціўнікамі на гэтым сойміку былі полацкі войскі Ян, старадубскі стольнік Пётр і полацкі лоўчыч Тадэвуш Корсакі Удзельскія, Фабіян і Траян Корсакі Бабыніцкія і Юзаф Корсак Залескі [8, p. 5-5v]. У выніку перавага аказалася на баку Сяліцкага і яго саюзнікаў і хоць з пратэстамі былі абраны дэпутатамі дудзскі старосціч Ян Буйніцкі і полацкі гараднічыч Адам Шчыт [9, k. 7-8].

З-за барацьбы паміж рознымі шляхецкімі групоўкамі быў сарваны полацкі грамнічны соймік 1738 г. На наступны дзень частка ўраднікаў прыватна сабралася і пад дырэкцыяй полацкага войскага Яна Корсака Удзельскага абрала паслоў да караля Юзафа Корсака Залескага і полацкага стражніка Эліяша Гласко па ўніверсал для правядзення элекцыйнага сойміка для выбара полацкага ваяводы. Супраць гэтага пратэставала 76 полацкіх шляхцічаў на чале з полацкім ротмістрам Ігнатам Корсакам Бабыніцкім, вайпунскім старостам Міхалам Сяліцкім і полацкім ротмістрам Фабіянам Корсакам Бабыніцкім [4, с.111; 10, с. 190; 11, с. 44]. Як бачым, Сяліцкі быў на чале гэтай шляхецкай групоўкі разам з прадстаўнікамі рода Корсакаў Бабыніцкіх. Іх моцы не хапала, каб атрымаць перавагу на полацкім сойміку. У адсутнасць Юзафа Шчыта і Буйніцкіх моцы

PolotskSU

гэтай групоўкі Сяліцкага і Корсакаў Бабыніцкіх хапіла толькі, каб пратэставаць супраць гэтага сойміка. Аднак, гэтая пратэстацыя стала падставай прызнання выбараў паслоў да караля незаконнымі.

Сітуацыя ў Полацкім ваяводстве змянілася паміж грамнічным і пасольскім соймікамі 1738 г. Ужо перад полацкім пасольскім соймікам 1738 г. (у ноч з 26 на 27) Міхал Сяліцкі разам з Траянам, Янам, Пятром і Станіславам Корсакамі моцна збілі і аграбілі шляхцічаў Яна Рудзевіча і Яна Караля Палубінскага [11, с. 45]. На пасольскім сойміку 1738 г. перавагу ўжо атрымалі Міхал Сяліцкі і яго саюзнікі. У выніку дырэктарам сойміка быў абраны Сяліцкі, а пасламі на сойм былі абраны дудзскі староста Ян Буйніцкі і Геранім Корсак Удзельскі [10, с.105; 12, s. 224]. Супраць іх выбара была занесены пратэстацыі. Мясцовая шляхта на чале з полацкім земскім суддзёй Траянам Гласко сцвярджала, што полацкі войскі Ян Корсак Удзельскі, Пётр Корсак Удзельскі, чашнік ВКЛ Юзаф Шчыт і вайпунскі староста Міхал Сяліцкі на чале сваіх прыхільнікаў перашкаджалі распачаць пасяджэнні сойміка вышэйшаму мясцоваму ўрадніку полацкаму земскаму суддзе Траяну Гласко і не далі яму як камісару чыніць рэляцыю аб працы Правіцыйнай камісіі ВКЛ па павялічэнню войска. Потым, пагражаючы зброяй і незвяртаючы ўвагі на пратэстацыі, абралі дырэктарам Міхала Сяліцкага і паслоў на сойм Яна Буйніцкага і Гераніма Корсака Удзельскага, а таксама паслоў па ўніверсал да караля на элекцыйны соймік па выбару полацкага ваяводы полацкага гараднічага Базыля Корсака Бабыніцкага і полацкага абознага Яна Войну [4, с. 111; 10, с. 104-105, 190-191; 13, s. 88]. Як бачым адбылася пэўная перагрупіроўка сіл у Полацкім ваяводстве. Перавага аказалася на баку кааліцыі Юзафа Шчыта, Міхала Сяліцкага, Буйніцкіх, Корсакаў Удзельскіх і Корсакаў Бабыніцкіх. Вайпунскі староста Міхал Сяліцкі займаў вядучыя ролі ў гэтай кааліцыі і быў названы адным з трох лідараў разам з чашнікам ВКЛ Шчытом і полацкім войскім Корсакам Удзельскім. Больш таго, Сяліцкі абраны ад яе дырэктарам полацкага пасольскага сойміка 1738 г. Гэтая кааліцыя захавалася і ў наступным годзе. Полацкі грамнічны соймік 1739 г. быў сарваны. Гаспадарчы соймік 1739 г. таксама быў сарваны пасля выбара дырэктарам полацкага земскага суддзі Траяна Гласкі. Ініцыятарам зрыва былі Корсакі, крашуцкі староста Ян Буніцкі і вайпунскі староста Міхал Сяліцкі. Потым гэтыя ж шляхцічы сабраліся і абралі дырэктарам сойміка Марцэлія Байкоўскага і вызначылі паслоў да караля па ўніверсал на скліканне сойміка для выбара полацкага ваяводы Міхала Сяліцкага і Пятра Корсака Удзельскага [4, с. 112; 10, с. 105; 11, с. 45; 13, s. 88-89]. Поспехам для кааліцыі скончыўся і грамнічны соймік 1740 г. На якім дэпутатамі былі абраны крашуцкі староста Ян Буйніцкі і Канстанцін Юзаф Свалынскі. Атрымалася так, зноў дзякуючы перавазе саюза Шчытоў, Яна Буйніцкага, Міхала Сяліцкага і Корсакаў [13, s. 89; 14, p. 184v-185].

Сарваны быў полацкі пасольскі соймік 1740 г. Магчымай прычынай быў канфлікт паміж Міхалам і Янам Сяліцкімі, Ігнатам Жуком і Францішкам Даўмонтам з полацкім стольнікам Юзафам Пакашам. Пад час якога Сяліцкія і іх прыхільнікі нападалі на дом Пакаша на Вялікай вуліцы ў Полацку [10, с. 106]. Як бачна ў канцы 30-гг. – пачатку 40-х гг. XVIII ст. у грамадска-палітычным жыцці Полацкага ваяводства дамініравала кааліцыя

PolotskSU



Юзафа Шчыта, Корсакаў Бабыніцкіх, Яна Буйніцкага і Міхала Сяліцкага. Прычым Міхал Сяліцкі быў адным з лідараў гэтай кааліцыі.

Здаецца ў гэты час Міхал Сяліцкі застаецца прыхільнікам Радзівілаў, але праяўляе мала актыўнасці ў адстойванні іх інтарэсаў на полацкіх сойміках. Наадварот праз свайго родзіча Яна Буйніцкага ўтрымлівае кантакт з варожымі Радзівілам Сапегамі. Галоўнай прычынай кантактаў з Сапегамі было жаданне Сяліцкага захаваць у заставе ўладанне Юшкава. У пачатку 1742 г. Міхал Сяліцкі разам з Янам Буйніцкім прыехаў да Юзафа Станіслава Сапегі. На гэтай сустрэчы дамовіліся, што віленскі каад'ютар паабяцаў у гэтым годзе не выкупаць з заставы сваёй часткі Юшкава [15, p. 269]. У 1743 г. Сяліцкі, таксама, прымае патрэбнае Сапегам рашэнне і не перашкаджае выбарам у Полацку прыхільных Сапегам дэпутатаў полацкага ротмістра Фабіяна Корсака Бабыніцкага і сітнянскага старосты Юзафа Тадэвуша Рыпіньскага. На гэтым сойміку Сяліцкі і яго саюзнікі Буйніцкія ўжо дзейнічаюць разам са сваімі нядаўнімі сапернікамі Гласкамі [10, с. 107]. У наступным 1744 г. Міхал Сяліцкі зноў прысутнічаў на полацкім грамнічным сойміку, дзе дэпутатамі на Трыбунал ВКЛ былі абраны старадубскі гараднічы Ян Францішак Гласко і ладаснянскі староста Геранім Корсак Удзельскі [16, арк. 71адв]. На наступны дзень, на полацкім гаспадарчым сойміку 1744 г., Міхал Сяліцкі разам з Траянам Корсакам Бабыніцкім былі абраны пасламі да караля з просьбай правесці выбар полацкага ваяводы. Ужо 17 лістапада 1744 г. яны атрымалі ў Варшаве аўдыенцыю ў караля Аўгуста III, дзе прасілі выдаць універсал на выбары полацкага ваяводы [17, л. 39об]. Як бачым, Міхал Сяліцкі заставаўся на вядучых ролях сярод полацкай шляхты нават нягледзячы на тое, што ў пачатку 40-х гг. XVIII ст. сярод полацкай шляхты перавагу мелі прыхільнікі Сапегаў. Шмат у чым, так сталася дзякуючы далейшаму супрацоўніцтву Сяліцкага ў грамадска-палітычным жыцці Полацкага ваяводства з родзічам Янам Буйніцкім.

Пасля 1744 г. нам не ўдалося выявіць ніякай дзейнасці Сяліцкага на полацкіх сойміках да 1748 г. Прычым у гэты час ён становіцца вядучым радзівілаўскім прыхільнікам у Полацкім ваяводстве. Сяліцкі са згоды Міхала Казіміра Радзівіла канкурыруе аб выбар паслом на полацкім пасольскім сойміку 1748 г. Потым, праўда, Міхал Казімір Радзівіл пагаджаўся, каб Сяліцкі быў абраны паслом у Полацку, калі разам з ім будзе абраны хто-небудзь з роду Гласкаў. Калі гэта не атрымаецца, то Сяліцкі меў бы саступіць сваю канкурэнцыю на выбар паслом прадстаўніку рода Гласкаў. Такое рашэнне тлумачылася імкненнем Радзівіла, каб канкурэнцыя некалькі радзівілаўскіх прыхільнікаў не прывяла да зрыва сойміка. Дапамагаць Сяліцкаму мелі іншыя радзівілаўскія прыхільнікі ў Полацкім ваяводстве: полацкі кашталян Валяр'ян Жаба, полацкі войскі Фабіян Корсак Бабыніцкі, полацкі гараднічы Базылі Корсак Бабыніцкі, гусарскі харужы Людвік Корсак Бабыніцкі [18, k. 282-283, 366, 440-441]. У выніку ўсе гэтыя захады скончыліся безвынікова і полацкі пасольскі соймік 1748 г. быў сарваны [19, s. 304].

Ужо ў 1749 г. Міхал Сяліцкі стараўся ў інтарэсах Радзівілаў на грамнічных сойміках у Полацку і Віцебску [20, k. 3-4]. Асабліва Міхал Казімір Радзівіл прасіў Сяліцкага аб выбар на полацкім грамнічным сойміку 1749 г. прыхільных Радзівілам дэпутатаў [18, k. 591-592]. У выніку дэпутатамі ў Полацку былі абраны Габрыэль Медунецкі і Антоній

PolotskSU



Снарскі. Невядома ці дапамаглі стаpанні Сяліцкага, але абодва полацкія дэпутаты былі прыхільнымі Радзівілам.

У той жа час не прыносілі ўдачы і старанні Сяліцкага стаць дэпутатам на Трыбунал ВКЛ ці паслом на сойм Рэчы Паспалітай. Сяліцкі быў канкурэнтам на выбар дэпутатам на віцебскім грамнічным сойміку 1750 г. Міхал Антоній Сапега быў пэўным, што ўдасца перашкодзіць гэтым яго планам. Для гэтага меркавалася прымірыць шляхцічаў Качаноўскага і Гурку, якія і мелі стаць дэпутатамі ў Віцебску і такім чынам перашкодзіць Сяліцкаму [21, p. 57v]. У выніку Сяліцкі пры падтрымцы Радзівілаў беспаспяхова канкурыраваў аб выбар дэпутатам на гэтым віцебскім грамнічным сойміку, бо гэты соймік быў сарваны [20, k. 8]. 19 студзеня 1750 г. Міхал Казімір Радзівіл прасіў Сяліцкага аб выбар прыхільных дэпутатаў на полацкім грамнічным сойміку [22, k. 92]. Гэта скончылася няўдачай, бо абраныя полацкімі дэпутатамі полацкі гродскі сурагатар Траян Корсак Бабыніцкі і полацкі стальніковіч Антоній Пакаш, якія былі прыхільнікамі Фаміліі. Магчыма, што па ініцыятыве Сяліцкага 25 дробных полацкіх шляхцічаў падпісалі пратэстацыю супраць абраных дэпутатаў і актыкавалі яе ў віцебскім гродскім суддзе. У ёй сцвярджалася, што соймік разыйшоўся безвынікова, а ўжо на наступны дзень частка шляхты ў неналежным месцы не на замку, а ў кляштары францішканаў абрала дэпутатаў Корсака і Пакаша [23, арк. 63-64].

Абяцаў Міхал Сяліцкі старацца ў інтарэсах Радзівілаў і на грамнічных сойміках 1751 г. [20, k. 22]. Сам паехаў на соймік у Полацк. У выніку гэты полацкі грамнічны соймік 1751 г. быў сарваны. Дапамог ён там Радзівілам на полацкім гаспадарчым сойміку 1751 г., калі полацкая шляхта склала рэскрыпт у адказ на ліст Міхала Антонія Сапегі. Амаль уся шляхта “моцна запрашала” яго на ўрад полацкага ваяводы. Аднак як раз супрацівы радзівілаўскіх прыхільнікаў вайпунскага старосты Міхала Сяліцкага і полацкага чашніка Юзафа Рэвута прымусілі змяніць тэкст на больш нейтральны заклік да Сапегі “старацца аб братэрскія галасы” [24, k. 1-2]. Дзейнічаў так Сяліцкі ў інтарэсах Радзівілаў, якія не былі зацікаўлены ў атрыманні Сапегай гэтага ўрада.

У 1752 г. Міхал Сяліцкі прапаноўваў Міхалу Казіміру Радзівілу як магчымы кандыдат на выбар паслом у 1752 г. ад прарадзівілаўскай групоўкі ў Полацкім ваяводстве Сымона Тадэвуша Пжысецкага [20, k. 24]. Сам Міхал Сяліцкі меў абяцанне шляхты Віцебскага ваяводства ў падтрымцы яго кандыдатуры да выбара паслом на сойм 1752 г. Акрамя таго, Сяліцкі прасіў такую ж падтрымку для выбара паслом на віцебскім сойміку ў Міхала Казіміра Радзівіла [20, k. 23]. Праўда, з невядомых прычынаў Сяліцкі не стаў паслом на віцебскім сойміку, а віцебскімі пасламі былі абраны абозны ВКЛ Леанард Пацей і віцебскі гараднічы Марцін Гурко. Магчыма, што як раз радзівілаўскаму прыхільніку Пацею і меў саступіць Міхал Сяліцкі сваю канкурэнцыю.

Нягледзячы на прыналежнасць да радзівілаўскай групоўкі Міхал Сяліцкі працягваў супрацоўнічаць у Полацкім ваяводстве з сапежынскімі прыхільнікамі Буйніцкімі, а ў першую чаргу з Янам Буйніцкім. У 1749 г. услед за Буйніцкім сапсаваліся адносіны Міхала Сяліцкага з Корсакамі Бабыніцкімі [13, s. 91; 20, k. 15-16]. Яшчэ адной прычынай акрамя салідарнасці з Буйніцкімі была змаганне з Траянам Корсакам Бабыніцкім з-за вызваліўшыйся ўрад полацкага гродскага сурагатара. Нажаль Сяліцкі прайграе гэтую

PolotskSU



канкурэнцыю і полацкім гродскім сурагатарам пры падтрымцы Фаміліі становіцца Траян Корсак Бабыніцкі [20, k. 1, 5].

У гэты час Сяліцкі незадаволены Радзівіламі пераходзіць у шэрагі іх сапернікаў. Прычынай гэтага маглі быць няўдачы ў атрыманні пры падтрымцы Радзівілаў урада полацкага гродскага сурагатара і полацкага стольніка ў 1749 г. [20, k. 1, 5]. У 1750 г. такі самы лёс напаткаў Сяліцкага пры старанні аб урад віцебскага гродскага сурагатара, а ў 1752 г. – полацкага войскага [20, k. 13, 24; 22, k. 380]. Канчаткова Сяліцкі зблізіўся да праціўнікаў Радзівілаў прыхільнікаў Фаміліі пад час падрыхтоўскі да выбараў полацкім ваяводаў Аляксандра Сапегі ў канцы 1752 – пачаку 1753 гг. Асабліва моцна аб гэтым пастараўся полацкі стольнік Ян Буйніцкі, які 17 снежня 1752 г. схіліў Міхала Сяліцкага на бок Аляскандра Сапегі. Міхал Сяліцкі на гэтых перамовах выказаў шмат розных заўваг супраць Сапегаў, але потым пры актыўным старанні Яна Буйніцкага і Мікалая Тадэвуша Лапацінскага пагадзіўся падтрымаць выбар полацкім ваяводай Аляксандра Сапегу. У сваю чаргу Аляксандр Сапега абяцаў, што Сапегі пайдуць насустрач патрабаванням Сяліцкага ў справе трымання ў заставе Юшкава [10, с. 75]. Да таго ж пастараўся аб пераходзе на бок Фаміліі і канцлер ВКЛ Міхал Чартарыйскі [4, с. 114; 10, с. 59-60; 25, p. 5-8]. Такім чынам, становіцца вядомым другі чынік, які перацягнуў Міхала Сяліцкага на бок Фаміліі – канцлер ВКЛ Міхал Чартарыйскі.

У сваю чаргу Міхал Казімір Радзівіл бачыў менавіта Сяліцкага адным з лідараў сваёй групоўкі, якая мела перашкодзіць Аляксандру Сапеге стаць полацкім ваяводай, а садзейнічаць іншаму канкурэнту Юрыю Радзівілу [26, k. 456-457]. Аднак, Сяліцкі застаўся верным слову дадзенаму Сапегам і нават першым павіншаваў Аляксандра Сапегу на элекцыйным сойміку пасля выбара полацкім ваяводай [10, с. 81]. Менавіта пераход Сяліцкага на бок Фаміліі і стаў адной з галоўных прычын паспяховага выбара полацкім ваяводай Аляксандра Сапегі.

У гэты час абвастрыліся адносіны Міхала Сяліцкага з бяльскім старостай Францішкам Жабай. З-за меўшыхся спрэчных судовых спраў з Францішкам Жабай Сяліцкі быў незадаволены, што той стаў смаленскім дэпутатам на Трыбунал ВКЛ 1753 г. Аднак, пры пасрэдніцтве Сапегаў Сяліцкі гатовы быў не супрацьдзейнічаць у выпадку вырашэння спрэчных спраў [27, p. 1v]. Гэты канфлікт з родам Жабаў расцягнуўся на шмат гадоў і безумоўна ўскладніў сітуацыю Міхала Сяліцкага ў грамадска-палітычным жыцці Полацкага ваяводства [28, s. 365-366].

У гэты час Сяліцкі разам з Грабніцкімі, Зяновічамі, Буйніцкімі і Корсакамі Бабыніцкімі складаў групоўку прыхільнікаў Фаміліі ў Полацкім ваяводстве. Для ўмацавання сувязяў з Грабніцкімі разглядаўся варыянт жаніцьбы Адама Грабніцкага з дачкой Міхала Сяліцкага Аленай [29, p. 179v]. Нажаль па невядомых прычынах гэтыя планы былі не рэалізаваны. Замест Грабніцкага Алена з Сяліцкіх выйшла замуж за полацкага земскага сурагатара Антонія Вінцэнта Пакаша. Фактычна Сяліцкія абралі ўмацаванне сувязяў з Пакашамі, а не з Грабніцкімі. Магчыма з-за сарваўшайся жаніцьбы з гэтага часу назіраецца пэўнае ахаладжванне паміж лідарамі прыхільнікаў Фаміліі ў Полацкім ваяводстве рэгентам канцыляры ВКЛ Міхалам Сяліцкім і Грабніцкімі. У той

PolotskSU



жа час замужаства Алены ўзмацняе сувязі Сяліцкіх з уплывовым у Полацкім ваяводстве родам Пакашаў, які, таксама, належыў да прыхільнікаў Фаміліі.

Найбольш актыўна ў грамадска-палітычным жыцці Полацкага ваяводства вайпунскі староста Міхал Сяліцкі працягваў супрацоўнічаць з Янам Буйніцкім. Менавіта Сяліцкага і Буйніцкага абвінавачвалі Корсакі ў зрыве полацкага грамнічнага сойміка 1754 г., бо яны не хацелі дапусціць выбару дэпутатам Людвіка Корсака Бабыніцкага. Таму па іх загаду не адмаўляўся ад сваёй канкурэнцыі быць абраным дэпутатам Тадэвуш Пжысецкі, пляменнік Сяліцкага [4, s. 93; 30, p. 333-333v]. Былі ў Сяліцкага і асабістыя прычыны непрыязні з Корсакамі. Міхал Сяліцкі не хацеў, каб полацкім падваяводай стаў Траян Корсак Бабыніцкі. Сяліцкі сам прэтэндаваў на гэты ўрад [11, с. 48].

У гэты час Сяліцкі яшчэ больш зблізіўся з лідарам Фаміліі канцлерам ВКЛ Міхалам Чартарыйскім. Менавіта Міхала Сяліцкага і Яна Буйніцкага Чартарыйскі бачыў найбольш падыходзячымі кандыдатамі на выбар пасламі з полацкага пасольскага сойміка 1754 г. У сваю чаргу Ян Буйніцкі лічыў, што не можа стаць паслом на полацкім сойміку разам з Міхалам Сяліцкім, бо сапернікі не дапусцяць выбара пасламі прадстаўнікоў адной групоўкі. Хутчэй усяго другім паслом меў стаць прадстаўнік уплывовай у Полацкім ваяводстве групоўкі Корсакаў, хутчэй усяго Траян Корсак Бабыніцкі [4, с. 114-115; 10, с. 169; 31, p. 38-38v, 39-40]. Фактычна ў такім выпадку адбыўся бы выбар лідараў двух самых уплывовых груповак: Корсакаў (Траян Корсака Бабыніцкі) і групоўкі Буйніцкіх, Сяліцкіх і Пжысецкіх (Міхала Сяліцкага). Міхал Сяліцкі спачатку не пагаджаўся старацца аб выбар паслом на полацкім пасольскім сойміку 1754 г. Сяліцкі меркаваў, што яго выбару перашкодзіць канфлікт з Корсакамі, а дакладней з адным з іх лідараў Людвікам Корсакам Бабыніцкім. Да таго ж, асабііста не напісалі да Сяліцкага ў гэтай справе Міхал Чартарыйскі і Міхал Антоній Сапега. Без падтрымкі канцлера ВКЛ і падканцлера ВКЛ Міхал Сяліцкі не хацеў канкурыраваць аб выбар паслом. Аднак потым, Сяліцкі пагадзіўся паддаўшыся ўгаворам Яна Буйніцкага і Мікалая Тадэвуша Лапацінскага. Ды і Міхал Чартарыйскі і Міхал Антоній Сапега напісалі да Сяліцкага лісты з просьбай пастарацца аб выбар паслом на полацкім сойміку 1754 г. [31, p. 39-40].

У гэты час Радзівілы сталі прадпрымаць крокі, каб перашкодзіць Аляксандру Сапеге заняць урад полацкага ваяводы. Не застаўся ў баку ад гэтага і Міхал Сяліцкі, які публічна выказаў падканцлеру ВКЛ Міхалу Антонію Сапегу незадаволенасць яго пляменікам полацкім ваяводай, а дакладней як той размеркаваў гродскія ўрады [32, p. 42v]. Як казалася вышэй Міхал Сяліцкі прэтэндаваў на ўрад полацкага падваяводы і быў незадаволены рашэнннем полацкага ваяводы Аляксандра Сапегі надаць гэты ўрад Траяну Корсаку Бабыніцкаму. Ды і саюзнік Сяліцкага Юзаф Буйніцкі меў саступіць урад полацкага гродскага пісара Станіславу Грабніцкаму. Адначасова на карысць Сяліцкага і яго прыхільнікаў было тое, што полацкім гродскім суддзёй быў прызначаны Сымон Тадэвуш Пжысецкі. Гэта быў прадстаўнік рода, які быў родзічам Сяліцкіх і супрацоўнічаў з імі ў грамадска-палітычным жыцці Полацкага ваяводства. Гэта часова прымірыла Сяліцкага з Сапегамі [15, p. 30].

Незадаволенасць Сяліцкага імкнуліся выкарыстаць Радзівілы. У гэты час у Полацкім ваяводстве рэтаўскі староста Крыштаф Тышкевіч спрабуе сфарміраваць варожую

PolotskSU



групоўку полацкаму ваяводзе Аляксандру Сапеге. Магчымым саюзнікам яму бачыцца вайпунскі староста Міхал Сяліцкі [29, р. 200]. Аднак, Міхал Сяліцкі не быў зацікаўлены такой прапановай. Ён стаў рэгентам канцылярыі ВКЛ і адначасова набліжанай асобай да канцлера ВКЛ і лідара Фаміліі Міхала Чартарыйскага. Магчыма Сяліцкі дапамог на Трыбунале ВКЛ 1755 г. перацягнуць на бок Фаміліі свайго пляменіка полацкага дэпутата Тадэвуша Пжысецкага. Сяліцкі аказваецца сярод галоўных прыхільнікаў асабіста Міхала Чартарыйскага. Не было нічога дзіўнага, што канцлер ВКЛ цікавіўся магчымасцю, каб Сяліцкі і Пжысецкі сталі трымальнікамі Полацкай эканоміі [29, р. 208v]. Аднак у Аляксандра Сапегі наконт гэтага былі свае планы. Гэта яшчэ раз паказала, што ўнутры Фаміліі Сяліцкі стаў прыхільнікам Міхала Чартарыйскага, але не Сапегаў.

Праўда, Сапегі былі вымушаны, каб прыбраць перашкоды з боку Міхала Сяліцкага, аддалі яму “вячыстае права” на частку Юшкава да часу, калі той атрымае прывілей на рэгента канцылярыі ВКЛ. Праўда, Сяліцкі па атрыманню гэтага прывілея не аддаў Аляксандру Сапеге гэтых папераў на валоданне часткай Юшкава, бо пакінуў іх дома. Прыхільнік Сапегаў Мікалай Тадэвуш Лапацінскі спадзяваўся, што там Сяліцкі вярне яе Сапегу, бо ў іншым выпадку “той дарагі наш прыяцель будзе нас і за гонар і замяшальніцтва трымаў” [29, р. 208]. Нажаль невядома, чым скончылася гэта справа аб уласнасць Юшкава. Як можна, меркаваць Сяліцкі вярнуў дакументы на ўласнасць Юшкава Сапегамі, але далей трымаў у заставе гэтае ўладанне.

Вялікім пытаннем было размеркаванне земскіх урадаў у Полацкім ваяводстве пад час элекцыйных соймікаў у ліпені 1755 г. з-за вялікай колькасці кандыдатаў на гэтыя ўрады [29, р. 201]. Сяліцкі быў кандыдатам на выбар полацкім харужым. На гэты ўрад, таксама, прэтэндаваў полацкі лоўчыч Ігнат Корсак Бабыніцкі, што зноў абвастрала адносіны ў Полацкім ваяводстве паміж Сяліцкім і ўплывовай групоўкай Корсакаў. Прычым амбіцыі Сяліцкага былі большымі. Сяліцкі быў незадаволены, што Траян Корсак Бабыніцкі будзе падваяводай, а таксама канкурэнцыі таго да першага земскага ўрада ў Полацкім ваяводстве – полацкага падкаморыя. Міхал Сяліцкі пагаджаўся нават адмовіцца ад канкурэнцыі да ўрада полацкага харужага на карысць Ігната Корсака Бабыніцкага, калі Траян Корсак Бабыніцкі аддась яму ўсё, што атрымаў ад Аляксандра Сапегі пад час выбараў полацкім ваяводай. Як вядома, гэта былі значныя фінансавыя сродкі (4 тысячы злотых) і ўрад полацкага падваяводы [10, с. 78]. Адначасова сапежынскі прыхільнік Мікалай Тадэвуш Лапацінскі, каб дамагчыся прыхільнасці Сяліцкага прасіў Аляксандра Сапегу купіць для яго ўрад рэгента канцылярыі ВКЛ у Дамініка Сухадольскага. Гэты ўрад, па парадзе Яна Буйніцкага, “хоць пустым цітулам” можна было задаволіць Сяліцкага [29, р. 199v]. Праўда, магчыма, што такім спосабам Буйніцкі наадварот дзейнічаў у першую чаргу ў інтарэсах Сяліцкага і імкнецца атрымаць пажаданы для таго ўрад. Праўда, потым з’явіліся чуткі, што Сяліцкі хацеў адмовіцца ад урада рэгента ВКЛ, каб быць абраны полацкім харужым [32, р. 75v]. Прычынай было тое, што Фамілія перастае быць прыдворнай групоўкай. У такой сітуацыі Сяліцкі сумняваўся, што яе лідары канцлер ВКЛ і падканцлер ВКЛ атрымаюць урады для сваіх прыхільнікаў. Таму Сяліцкі лічыў, бачыў лепш атрымаць зараз урад полацкага харужага, бо далейшыя магчымыя ўрады для прыхільнікаў Фаміліі для атрымання ў караля былі

PolotskSU



малаверагоднымі [31, p. 51-52]. У выніку, праўда Міхал Сяліцкі захварэў перад выездам на элекцыйныя соймікі. Як рабіў выснову Мікалай Тадэвуш Лапацінскі, то “можа таксама Пан Бог хацеў яго прытрымаць ад соймікаў” [32, p. 64]. Адсутнасць Сяліцкага не паўплывала і на выніке соймікаў, якія былі сарваны з-за вялікай колькасці канкурэнтаў на земскія ўрады.

Тым часам у Полацкім ваяводстве ўспыхнуў канфлікт паміж прыхільнікамі Фаміліі Сяліцкімі і Грабніцкімі. Непасрэднай прычынай яго сталі справы хлявінскага і бецкага староства. 16 лістапада 1754 г. Аўгуст III надаў хлявінскае староства сыну Міхала Сяліцкага Юзафу. Грабніцкія сцвярджалі, што такога староства не існуе і рэгент канцылярыі ВКЛ Міхал Сяліцкі падмануў караля падаўшы на подпіс такі прывілей. Менавіта таму, Станіслаў Грабніцкі 12 снежня 1755 г. не даў заняць Хлевішча Юзафу Сяліцкаму [33, арк. 1055-1056адв]. Гэтая справа расцягнулася на некалькі гадоў. У 1758 г. Станіслаў Грабніцкі распачаў справу супраць Юзафа Сяліцкага аб падмане ў фарміраванні і падачы каралю прывілея на неіснуючае староства Хлевішча, незаконнасці ўжывання тытулу хлявінскага старосты і фальшаванні розных абвінавачванняў на Грабніцкага [34, арк. 663-664адв]. Сам Грабніцкі прадставіў прывілей сабе на Хлевішчы ад полацкага ваяводы Аляксандра Сапегі ад 10 студзеня 1753 г., а таксама пацвярджэнне гэтага прывілея ад ўсё таго ж Сапегі ад 26 мая 1756 г. Меў Грабніцкі і адпаведны каралеўскі прывілей на Хлевішча ад 5 лістапада 1757 г. У выніку 22 верасня 1758 г. і 13 лістапада 1758 г. тая справа разглядалася перад асэсарскім судом. Юзаф Сяліцкі не з’явіўся на яе разгляд і не прадставіў ніякіх дакументаў для пераносу разгляду гэтай справы. За гэта Юзаф Сяліцкі быў асуджаны на баніцыю і на выплату тысячы злотых [35, арк. 390-393 адв]. Такім чынам, гэтая справа скончылася няўдачай для Сяліцкіх нягледзячы на прыязнае стаўленне да іх канцлера ВКЛ Міхала Чартарыйскага.

Яшчэ большым канфлікт паміж Сяліцкімі і Грабнцкі стаў з-за справы бецкага староства. Аўгуст III надаў Адаму Грабніцкаму бецкае староства, якое вызвалілася пасля смерці Казіміра Жука. Падскарбі ВКЛ Юрый Флемінг 26 мая 1755 г. падрыхтаваў адпаведныя дакументы на заняцце гэтага староства. 2 чэрвеня 1756 г. бецкае староства было перададзена Грабніцкаму скарбовымураднікам. Больш таго, 28 мая 1756 г. Юрый Флемінг напісаў адпаведны ліст Міхалу Сяліцкаму аб памылковай выдачы прывілея на бецкае староства Тадэвушу Пжысецкаму і законнасці раней выдадзенага прывілея Грабніцкага. Менавіта таму падскарбі ВКЛ прасіў не перашкаджаць Адаму Грабніцкаму ў трыманні гэтага староства [36, p. 61; 37, арк. 803-804адв, 805-806адв, 807-808адв, 813-814адв]. Аднак Сяліцкі не хацеў саступаць і падтрымаў прэтэнзіі на староства шэвінскага старосты Тадэвуша Пжысецкага. Апошні нават напаў на бецкае староства [37, арк. 1158-1159адв, 1748-1755адв].У выніку ў канфлікт мелі ўмяшацца лідары Фаміліі. На нарадзе Міхала Чартарыйскага і Міхала Антонія Сапегі было вырашана, што Антоній Грабніцкі саступіць бецкае староства Пжысецкаму, а той у сваю чаргу мае выплаціць полацкаму гараднічаму кампенсацыю [38, p. 53].

Нягледзячы на гэта, 17 чэрвеня 1757 г. Грабнцікія атрымалі ў Трыбунале ВКЛ дэкрэт супраць Тадэвуша Пжысецкага і Міхала Сяліцкага. Тыя, акрамя вызначаных раней полацкім гродскім суддом 106 талераў бітых (2500 злотых 2 шостакаў і 6 грошай),

PolotskSU



вызначыў яшчэ выплату 8000 злотых за перашкоды ў выкананні гэтага рашэння і за зробленыя шкоды ў бецкім старостве. Акрамя таго, Пжысецкі і Сяліцкі за зробленыя ўчынкі і за нез'яўленне на разгляд іх справы ў Трыбунале ВКЛ аб'яўляліся інфамісамі [39, p. 316-321v]. Больш таго, Міхал Сяліцкі з 21 на 22 мая 1756 г. напаў на двараніна падскарбія ВКЛ Юрыя Флемінга Шулякевіча. Менавіта той быў дасланы Флемінгам для падання бецкага староства Адаму Грабніцкаму і вырашэння памежных спрэчак. У выніку Сяліцкі збіў Шулякевіча спачатку кулакамі, а потым хацеў выхваціць шаблю. Шулякевіч перашкаджаў і Сяліцкі не дастаў шаблі, а толькі разам з сваім прыхільнікам Шэмешам выкруцілі яму палец. Уцякаючага Шулякевіча Сяліцкі два разы ўдарыў шабляй у ножнах. Шулякевіч з акрываўленай галавой упаў, то Сяліцкі падбег і збіў яго гэтай шабляй у ножнах. Потым Сяліцкі дастаў шаблю і хацеў секчы Шулякевіча, то апошняга выратавала толькі ўмяшальніцтва слугі рэгента канцылярыі ВКЛ, які перашкодзіў свайму гаспадару секчы. У сваю чаргу Сяліцкі абвяргаў гэтыю інфармацыю і сцвярджаў, што гэта Шулякевіч разам з Макарскім апоўначы нечакана ўварваўся ў ізбу, дзе спаў Сяліцкі. Шулякевіч загадаў сваім слугам страляць. Сяліцкі быў вымушаны абараняцца і параніў Шулякевіча. Акрамя таго, Сяліцкі абвінавачваў Шулякевіча ў розных шкодах зробленных сялянам бецкага староства. У выніку Трыбуналам ВКЛ 26 жніўня 1757 г. было прынята рашэнне пра ўдакладненне ўсіх зробленых шкодаў з абодвух бакоў, а справу сапраўднасці прывілеяў на бецкае староства адсылася да разгляду асэсарскага суда [39, p. 789-798v].

У гэты час заняты судовымі справамі Міхал Сяліцкі меньш актыўна ўдзельнічае ў грамадска-палітычным жыцці Полацкага ваяводства. Магчыма паўплывала на гэта і разрыў у канцы 1758 г. Сапегаў з Фаміліяй. Міхал Сяліцкі застаецца прыхільнікам Фаміліі і асабіста Міхала Чартарыйскага, а яго сапернікамі ў Полацкім ваяводстве становяцца прыхільнікі Сапегаў і ранейшыя яго ворагі Корсакі Бабыніцкія. Перад полацкім пасольскім сойміку 1761 г. Міхал Сялцікі з'явіўся як кандыдат ад прыхільнікаў Фаміліі на надзвычайны сойм 1761 г. Разам з ім, як кандыдат каралеўскага двара, меў бы стаць паслом мсціслаўскі гродскі староста Мікалай Тадэвуш Лапацінскі, але апошні адмовіўся і полацкі пасольскі соймік 1761 г. скончыўся безвынікова [32, p. 103]. У наступным 1762 г. з вялікімі цяжкасцямі, ужо на паўторным пасольскім сойміку, рэгент канцылярыі ВКЛ Міхал Сяліцкі быў абраны паслом разам з Мікалаем Тадэвушам Лапацінскім [40, с. 571; 41, арк. 895].

У гэты час Сяліцкі фактычна становіцца лідарамі прыхільнікаў Фаміліі ў Полацкім ваяводстве. Менавіта ён, як мясцовы лідар Фаміліі, у снежні 1762 г. у Варшаве правёў перамовы з Аляксандрам Сапегай аб выбарах на полацкім грамнічным сойміку 1763 г. Сяліцкі абяцаў, што калі пагадзяцца на дэпутацтва яго сына Юзафа, то прыхільнікі Фаміліі пагодзяцца на выбар яму калегай любога прыхільніка Сапегі. У выніку Аляксандр Сапега прыняў такую прапанову і прасіў Мікалая Тадэвуша Лапацінскага прапанаваць такога кандыдата [15, p. 62]. Праўда, у выніку гэты план быў зменены і канкурэнтамі ад варагуючых груповак аб выбар дэпутатамі ў 1763 г. у Полацкім ваяводстве сталі іншыя асобы.

PolotskSU



Высновы. Такім чынам, магчыма зрабіць наступныя высновы. Міхал Сяліцкі паходзіў з рода, які меў значныя ўплывы ў Полацкім і Віцебскім ваяводствах. Міхал Сяліцкі галоўным чынам дзейнічаў на сойміках Полацкага ваяводства. Адначасова, за ўсё сваё жыццё Міхал Сяліцкі так і не займаў ніводнага ўрада ў Полацкім ваяводстве. Нягледзячы на гэта, ён валодаў значнымі ўплывамі сярод мясцовай шляхты. Так атрымалася, дзякуючы ўдаламу выбару Сяліцкім палітычных саюзнікаў. Упачатку панавання Аўгуста III гэта былі чашнік ВКЛ Юзаф Шчыт, Корсакі Бабыніцкія, Корсакі Удзельскія і Буйніцкія. Апошнія супрацоўнічалі ў Полацкім ваяводстве з Сяліцкім усё панаванне Аўгуста III, што было падмацавана родаснымі сувязямі (Міхал Сяліцкі быў жанаты на Элеаноры з Буйніцкіх). Ян Буйніцкі становіцца бліжэйшым паплечнікам Міхала Сяліцкага. Разам яны найбольш зацята змагаюцца ў Полацкім ваяводстве з магутнай групоўкай Корсакаў Бабыніцкіх. Адначасова стараюцца ў інтарэсах адзін аднаго ў сваіх магнацкіх пратэктараў Радзівілаў і Сапегаў. Міхал Сяліцкі да канца 1752 – пачатку 1753 гг. быў прыхільнікам Радзівілаў, але потым незадаволены іх дапамогай у атрыманні новых урадаў, пры падтрымцы Яна Буйніцкага і канцлера ВКЛ Міхала Чартарыйскага становіцца прыхільнікам Фаміліі, часткай якой з'яўляліся Сапегі. Сяліцкі прыцягвае ў шэрагі Фаміліі і сваіх іншых родзічаў у Полацкім ваяводстве – род Пжысецкіх. Пры дапамозе Буйніцкага Міхал Сяліцкі атрымлівае дапамогу лідара Фаміліі канцлера ВКЛ Міхала Чартарыйскага. Гэта дапамагае яму ў канфлікце з іншымі прыхільнікамі Фаміліі Грабніцкімі. Пасля разрыву ў канцы 1758 г. Сапегаў з Фаміліяй Міхал Сяліцкі становіцца лідарам прыхільнікаў Фаміліі ў Полацкім ваяводстве. У тым ліку дзякуючы гэтаму ён быў абраны полацкім паслом на сойм 1762 г. Менавіта Міхал Сяліцкі ўзвышае свой род у грамадска-палітычным жыцці Полацкага ваяводства, што аблягчае ў будучым карьеру яго сыну Юзафу Сяліцкаму, які дасягае сенатарскага ўрада – полацкага кашталяна.

ЛІТАРАТУРА

1. Российский государственный исторический архив. – Ф. 1343. Оп. 29. Д. 2041.
2. Pamiętnik Felicyana Junoszy Piaskowskiego podstolego podlaskiego, majora J.K. Mości, poczawszy od roku 1690. – Lwów : K. Jabłoński, 1865. – 131 s.
3. Lietuvos valstybės istorijos archyvas. – SA 91.
4. Мацук, А. Род Буйніцкіх у Полацкім ваяводстве ў панаванне Аўгуста III / А. Мацук // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў (да 20-годдзя археалагічных і этнаграфічных экспедыцый ПДУ) : у 2 ч. – Наваполацк, 2014. – Ч. 2. – С. 107 – 116.
5. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. – Ф. 1878. Воп. 1. Спр. 2.
6. Archiwum Główne Akt Dawnych. Archiwum Publiczne Potockich. – Sygn. 71.
7. Deputaci Trybunału Głównego Wielkiego Księstwa Litewskiego (1697–1794) : Spis / pod red. Andrzeja Rachuby ; oprac. Andrzej Rachuba i Przemysław P. Romaniuk przy współpr. Andreja Macuka i Jewgienija Aniszczenki; Instytut Historii Polskiej Akademii Nauk. – Warszawa : DiG, 2004. – 448 s.
8. Lietuvos valstybės istorijos archyvas. – F. 1025. Ap. 1. B. 21.

PolotskSU




9. Archiwum Główne Akt Dawnych. Archiwum Radziwiłłów. – Dz. V. Sygn. 15669.
10. Мацук, А. Полацкае ваяводства ў XVIII ст.: ваявода, шляхецкая эліта, соймікі / А. Мацук. – Мінск : Беларуская навука, 2014. – 233 с.
11. Мацук, А. Палітычная дзейнасць Траяна Корсака Бабыніцкага ў панаванне Аўгуста III і Станіслава Аўгуста Панятоўскага / А. Мацук // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : у 2 ч. – Наваполацк, 2016. – Ч. 2. – С. 44–53.
12. Palkij H., Sejmy 1736 i 1738 roku. U początków nowej sytuacji politycznej w Rzeczypospolitej / H. Palkij. – Kraków : Polska Akademia Umiejętności, 2000. – 256 s.
13. Мацук, А. Ян Буйніцкі лідар шляхты Полацкага ваяводства ў панаванне Аўгуста III / А. Мацук // Szlachta i ziemiaństwo na pograniczu kulturowych dawnej Rzeczypospolitej od XVI do początku XX wieku / pod red. Dorota Michaluk, Krzysztof Mikulski. – Warszawa : DiG, 2015. – S. 85–96.
14. Lietuvos Mokslų Akademijos centrinės bibliotekos. – F. 17. OP. 1. B. 24.
15. Lietuvos valstybės istorijos archyvas. – F. 1135. Ap. 14. B. 23.
16. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. –Ф. 1734. Воп. 1. Спр. 32.
17. Российский государственный исторический архив. – Ф. 1343. Оп. 23. Д. 7170.
18. Archiwum Główne Akt Dawnych. Archiwum Radziwiłłów. – Dz. IV. Sygn. 870.
19. Diariusze sejmowe z wieku XVIII.– Warszawa : Towarzystwo Naukowe Warszawskie, 1911. – T.1. – 402 s.
20. Archiwum Główne Akt Dawnych. Archiwum Radziwiłłów. – Dz. II. Sygn. 14228.
21. Lietuvos valstybės istorijos archyvas. – F. 1135. Ap. 14. B. 24.
22. Archiwum Główne Akt Dawnych. Archiwum Radziwiłłów. – Dz. IV. Sygn. 872.
23. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. – Ф. 1709. Воп. 1. Спр. 18.
24. Archiwum Główne Akt Dawnych. Archiwum Radziwiłłów. – Dz.V. Sygn. 13085.
25. Lietuvos Mokslų Akademijos centrinės bibliotekos. – F. 139. OP. 1. B. 443.
26. Archiwum Główne Akt Dawnych. Archiwum Radziwiłłów. – Dz. IV. Sygn. 874.
27. Lietuvos Mokslų Akademijos centrinės bibliotekos. – F. 139. OP. 1. B. 4144.
28. Matuszewicz, M. Diariusz życia mego / M. Matuszewicz. –Warszawa : Państwowy Instytut Wydawniczy, 1986. – T. 2. – 815 s.
29. Lietuvos valstybės istorijos archyvas. – F. 1135. Ap. 14. B. 32.
30. Lietuvos Mokslų Akademijos centrinės bibliotekos. – F. 139. OP. 1. B. 5483.
31. Lietuvos valstybės istorijos archyvas. – F. 1135. Ap. 14. B. 17.
32. Lietuvos valstybės istorijos archyvas. – F. 1135. Ap. 14. B. 4.
33. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. – Ф. 1734. Воп. 1. Спр. 44.
34. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. – Ф. 1734. Воп. 1. Спр. 47.
35. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. – Ф. Кмф-18. Воп. 1. Спр. 422.
36. Lietuvos valstybės istorijos archyvas. – F. 599. Ap. 1. B. 103.
37. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. – Ф. 1734. Воп. 1. Спр. 45.
38. Lietuvos Mokslų Akademijos centrinės bibliotekos. – F. 119. OP. 1. B. 141.
39. Lietuvos valstybės istorijos archyvas. – SA 505.

PolotskSU



40. Мацук А., Барацьба магнацкіх груповак у ВКЛ (1717 – 1763 гг.) / А. Мацук. – Мінск : Медысонт, 2010. – 640 с.
41. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. – Ф. 1734. Воп. 1. Спр. 49.

## MIKHAIL SELITSKY IN THE SOCIO-POLITICAL LIFE OF THE POLOTSK VOEVODESTVO (PROVINCE) IN THE REIGN OF AUGUST III (1735 - 1763)

*A. MATSUK*

*Mihail Selitsky came from the well-known in the Polotsk and Vitebsk voevodestvos family. Selitsky did not occupy a single post in the Polotsk voevodestvo, but had considerable influence among the local gentry. This happened thanks to the successful choice of political allies: chashnik of the Grand Duchy of Lithuania (Grand Duke's Cup-Bearer of Lithuania) Jozef Shchit, the Korsak Bobynitskis, the Korsaks, the Udelskis and the Buynickis. The latter cooperated in the Polotsk voevodestvo with Selitskiy over a period of Augustus III reign, which was strengthened by kinship ties. Moreover, Yan Buynitsky becomes the closest ally and friend of Mihail Selitsky. Together they most persistently fight in Polotsk voevodestvo with the powerful Korsaki Bobynitskies gentry group. Mikhail Selitsky until the end of 1752 - the beginning of 1753 was a supporter of the Radzivils, but then, dissatisfied with their help in obtaining new posts, becomes a supporter of the Familia. He was favorably received by the leader of the Family, Chancellor of the Grand Duchy of Lithuania Mikhail Czartoryski and becomes his regent of the Chancery. Supporting of Czartoryski helps Selitsky in conflict with Grebnicki other supporters of the Familia. As a result, Mikhail Selitsky becomes the leader of the Familia in Polotsk voevodestvo.*

Keywords: *the Polotsk Voevodestvo (Province), sejmik, Sejm, gentry, noblemen, noblemen groups, the Radziwills, the Chartoriyskies.*